УДК 908(476.5)“18”:398(=161.3)

# Асветніцкая дзейнасць і лінгвістычныя назіранні Максіміляна Восіпавіча Маркса (1816–1893)

**Гарнак В.У.**
***Установа адукацыі “Віцебскі дзяржаўны ўніверсітэт імя П.М. Машэрава”, Віцебск***

*Максіміляян Восіпавіч Маркс нарадзіўся 19(7) кастрычніка 1816 года ў Віцебску. Царскім урадам у 1866 годзе за актыўны ўдзел у рэвалюцыйнай арганізацыі сасланы ў Сібір на пажыццёвае пасяленне. У 1887–1888 гг. М. Маркс напісаў успаміны “Запіскі старога” (“Записки старика”), а таксама некалькі артыкулаў мемуарнага характару.*

*Мэта даследавання – вывучэнне асветніцкай дзейнасці і лінгвістычных назіранняў М.В. Маркса.*

***Матэрыял і метады.** Матэрыялам паслужылі ўспаміны Максіміляна Восіпавіча Маркса. У працы выкарастаны апісальны і параўнальна-супастаўляльны метады.*

***Вынікі і іх абмеркаванне.** У артыкуле аналізуюцца асаблівасці маўлення жыхароў Віцебска ў першай палове XIX стагоддзя, узгадваюцца віцебскія (Э. Плятэр, Т. Лада-Заблоцкі, А. Зброжак, С. Маркіянавіч) і віленскія (А. Міцкевіч, Я. Чачот, В. Дунін-Марцінкевіч, К. Каліноўскі) прыхільнікі беларушчыны. У Маскве 1860-х гадоў М. Маркс – арганізатар і адзін з кіраўнікоў зямляцтва студэнтаў, выхадцаў з Беларусі і Літвы. Максіміляян Восіпавіч Маркс быў прыхільнікам абуджэння і разняволення тагачаснага грамадства.*

***Заключэнне.** Асабліва вялікая заслуга М.В. Маркса ў тым, што ён адзін з першых на Віцебшчыне, хто звярнуўся да вывучэння вуснай паэтычнай творчасці мясцовых жыхароў. Асветніцкая дзейнасць і цікавыя назіранні М.В. Маркса, безумоўна, сёння неабходныя лінгвістам, літаратуразнаўцам, этнографам і фалькларыстам.*

***Ключавыя словы:** Максіміляян Маркс, Віцебск, мемуары, беларушчына, вымаўленне, XIX стагоддзе.*

*(Ученые записки. – 2016. – Том 22. – С. 177–179)*

# Educational Activity and Linguistic Ideas of Maksimilian Osipovich Marks (1816–1893)

**Gornak V.V.**
***Educational Establishment “Vitebsk State P.M. Masherov University”***

*Maksimilian Osipovich Marks was born on October 19 (7), 1816 in Vitebsk. In 1866 in accordance with the Tsar Decree he was sentenced to life exile in Siberia for active participation in a revolutionary organization. In 1887–1888 M. Marks wrote memoirs “Old Man’s Notes” as well as some articles of memoir character.*

*The purpose of the research is to study educational activity and linguistic ideas of M.O. Marks.*

***Material and methods.** The material is M. Marks’s memoirs. The descriptive and the comparative methods are used in the research.*

***Findings and their discussion.** Features of speech of Vitebsk dwellers in the first half of the XIX century are analyzed in the article; Vitebsk (E. Pliater, T. Lada-Zablotski, A. Zbrozhak, S. Markiyanavich) and Vilnia (A. Mitskevich, Ya. Chachot, V. Dunin-Martsinkevich, K. Kalinovski) Belarusian language adherents are represented. In Moscow in the 1860-ies M. Marks was the organizer and one of the leaders of Belarusian and Lithuanian Student Union. Maksimilian Osipovich Marks was the supporter of awakening and liberation of the society.*

***Conclusion.** M.O. Marks’s special contribution was the fact that he was one of the first in Vitebsk Region who turned to studying oral poetic work of local dwellers. M. Marks’s educational activity and interesting ideas are certainly necessary for contemporary linguists, literary critics, ethnographers and folklorists.*

***Key words:** Maksimilian Marks, Vitebsk, memoirs, Belarusian language and culture, speaking, XIX century.*

*(Scientific notes. – 2016. – Vol. 22. – P. 177–179)*

Максіміляян Восіпавіч Маркс нарадзіўся 19(7) кастрычніка 1816 года ў Віцебску. Пасля заканчэння Віцебскай гімназіі (1834) вучыўся ў Маскоўскім універсітэце. Потым вярнуўся ў родны горад над Дзвіной. У 1850–1860-я гг. настаўнічаў у Смаленску, выкладаў у 4-й гімназіі Масквы. У 1866 годзе па справе Д.У. Каракозава (замах на цара Аляксандра II) і за актыўны ўдзел у польскай рэвалюцыйнай арганізацыі сасланы ў Сібір на пажыццёвае пасяленне. Там Максіміляян Маркс захапіўся вывучэннем прыроды і клімату Сібіры. За сваю навуковую дзейнасць Максіміляян Восіпавіч у 1878 годзе атрымаў Залаты медаль Рускага геаграфічнага таварыства. Доўгі

*Адрас для карэспандэнцыі: e-mail:* hornak@tut.by – **В.У. Гарнак**

час наш зямляк жыў у Енісейску, дзе і памёр у 1893 годзе.

У 1887–1888 гг. М. Маркс напісаў успаміны “Запіскі старога” (“Записки старика”) [1; 2], а таксама некалькі артыкулаў мемуарнага характару [3; 4].

Мэта даследавання – вывучэнне асветніцкай дзейнасці і лінгвістычных назіранняў М.В. Маркса.

**Матэрыял і метады.** Матэрыялам паслужылі мемуары Максіміляна Восіпавіча Маркса [1–4]. У працы выкарастаны апісальны і параўнальна-супастаўляльны метады.

**Вынікі і іх абмеркаванне.** У “Запісках старога” Максіміліян Восіпавіч сведчыць, што на вуліцах Віцебска ў пачатку XIX стагоддзя можна было лёгка пачуць беларускую, польскую, рускую і яўрэйскую мовы. Але царская ўлада мэтанакіравана разбурала гэта даволі мірнае суіснаванне культур і ў выніку зрабіла так, што недзе ў 1840-я гады ўжо *не было такога багацця народнасцяў, саслоўяў, касцюмаў, гутарковай мовы – усё гэта цяпер змылась, згладзілась і сцёрлась у нейкую аднастайнасць* [1, 1995, с. 74].

Найвышэйшыя чыноўнікі горада (губернатар, віцэ-губернатар, паліцмайстар, паштмайстар, дырэктар гімназіі, розныя дарадцы і г.д.) былі рускія, размаўлялі, натуральна, на сваёй роднай мове.

Дваранства, у першую чаргу памешчыкі, складалася з двух секцый: польскай (пераважна каталіцкай) і рускай (у асноўным праваслаўнай). Да першай групы, якая была даволі значнай, належалі землеўладальнікі з польскімі прозвішчамі. Усе яны, як заўважае мемуарыст, былі ў асноўным выпускнікамі Віленскага ўніверсітэта, прыхільнікамі апошняга караля Рэчы Паспалітай. Руская секцыя складалася з уласнікаў, якія атрымалі маёмасць пасля першага падзелу Рэчы Паспалітай. Такім чынам, буйныя і сярэднія землеўладальнікі карысталіся звычайна альбо польскай, альбо рускай мовай [1, 1995, с.75].

Дробная шляхта і чыншавікі паміж сабой размаўлялі звычайна па-беларуску, але ім хацелася больш ужываць польскую мову. У прыватнасці, М. Маркс піша: *Яны думалі, што беларускае слова, вымаўленае “ў нос” з прыбаўкай гука “ж” пасля “р” зробіцца польскім, і таму pies siedzi na progu вымаўлялі: “Пенс сендзі на пржогу”* [1, 1996, с. 97]. У выніку, як сведчыць мемуарыст, атрымлівалася своеасаблівая беларуска-польская “трасянка”.

У “Запісках старога”, на жаль, маецца толькі адзін прыклад беларускага маўлення. Гэта галашэнне вясковай жанчыны (Эміліі Плятэр. – *В.Г.*) [5, с. 85]. Вось як гэты маленькі ўрывак занатаваў мемуарыст:

*“Авой, авой, дзяцюк ты мой!*

*Не на радосць, не к счасцью ты родзився!”* [4, 1997, с. 138].

Як піша Маркс, маўленню віцяблян было характэрна тое, што яны канцавы t (т) у дзеясловах змякчалі на Č(ц’). Але не маглі змякчыць [р]. Напрыклад: *пішуць, будуць* замест *пішут, будут; зара, рад* замест *заря, ряд.* Адзначае мемуарыст і такую асаблівасць беларускай мовы, як наяўнасць [ў]. Віцяблянін пазначае гэты гук *и (v)* [4, с. 153]. Такім чынам, для вымаўлення жыхароў Віцебска першай паловы XIX стагоддзя ў галіне зычных, паводле М.В. Маркса, характэрна:

1) афрыката [дз’] мяккая і вымаўляецца як адзін гук;

2) наяўнасць мяккай афрыкаты [ц’];

3) гук [р] заўсёды цвёрды;

4) наяўнасць губна-губнога [ў].

Мемуарыст прыгадвае, што ў Віцебску таго часу было шмат аматараў беларушчыны. І сам малады Максіміліян уваходзіў у гурток прыхільнікаў беларускай мовы і культуры. Каштоўнымі і цікавымі з’яўляюцца артыкулы М. Маркса, якія апісаў і часткова надрукаваў прафесар Львоўскага ўніверсітэта Вільгельм Брухнальскі (1859–1938), “Emilia Platerówna jako folklorystka” [3], “Z pamiętnika M. Marksa Witebszczanina” [4].

Аўтар успамінаў з душэўнай цеплынёй піша пра сваіх землякоў – віцебскіх аматараў беларушчыны. Сярод самых адметных прадстаўнікоў фалькларыстыкі мемуарыст узгадвае Э. Плятэр (1806–1831) [3; 4, с. 147], таленавітага паэта Тадэвуша Ладу-Заблоцкага (1811–1847) [4, с. 147]. Сярод названых Марксам пачынальнікаў фалькларыстыкі на Віцебшчыне – Цвяцінскі, Аляксандр Зброжак (Зброжка), Станіслаў Маркіянавіч [4, с. 147]. Звестак пра іх, на жаль, вельмі мала. Ёсць інфармацыя аб тым, што Аляксандр Зброжак родам з Віцебшчыны, а Станіслаў Маркіянавіч – выпускнік віцебскай гімназіі. Абодва падазраваліся ва ўдзеле ў паўстанні 1831 года [2, с. 421, 431], а унтэр-афіцэр Аляксандр Зброжка, у прыватнасці, быў у паўстанцкім атрадзе Эміліі Плятэр [6, с. 237].

Мемуарыст расказаў пра Піліпа Смурага і Уласа – вядомых у 30–40-я гады XIX стагоддзя гутарніках. Запісаў наш зямляк і ўнікальны “Rodowod Bialoruski”. Максіміліян Восіпавіч сабраў цікавы матэрыял пра адзенне віцебскіх мяшчан (беларусаў, яўрэяў), забавы і танцы простых гараджан. З успамінаў Маркса можна даведацца пра папулярнасць у Віцебску “Энеіды навыварат”. Ва ўспамінах прысутнічае і тэкст ананімнага верша “Худа жыць на свеце стала”. Значную частку прыкладаў мемуарыст запісаў лацінкай па-бе-

ларуску [4, с. 139–144]. Распавёў М. Маркс і пра цікаўнасць да беларускай народнай паэзіі сярод славянафілаў, а таксама паміж студэнтаў Маскоўскага ўніверсітэта ў 30-я гады XIX стагоддзя [4, с. 152–153]. Даволі значная частка ўспамінаў прысвечана віленскім аматарам беларускай народнай культуры. Сярод іх узгадваюцца імёны А. Міцкевіча, Я. Чачота, В. Дуніна-Марцінкевіча. З асаблівай цеплынёй мемуарыст піша пра Кастуся Каліноўскага, называючы яго *вялікім руплiўцам і працаўніком мовы беларускай* [4, с. 151].

Хаця Максіміліян вучыўся ў Маскве, але мемуарыст з дабрынёй піша і пра Віленскі ўніверсітэт пачатку XIX стагоддзя. Гэта вышэйшая навучальная ўстанова, на думку мемуарыста, садзейнічала развіццю творчых здольнасцяў студэнцтва, умацоўвала маральныя якасці моладзі. На думку аўтара ўспамінаў, менавіта так неабходна вырашаць, у прыватнасці, і нацыянальнае пытанне: мірнае, натуральнае зближэнне і сяброўства народаў, а не гвалтоўная асіміляцыя культур.

Асабліва ўзрасло значэнне Віленскага ўніверсітэта ў пачатку XIX стагоддзя, калі ён стаў цэнтрам Віленскай навучальнай акругі, якая ахоплівала амаль усю тэрыторыю сучасных Беларусі і Літвы, а таксама частку Украіны. Закрыццё ўніверсітэта (1832), дзе канцэнтраваліся інтэлектуальныя сілы Беларусі, як гэта разумеў М. Маркс, значна ўскладніла шлях мясцовай моладзі да прыстойнай будучыні. Мемуарыст падкрэслівае: *Цяжка ўявіць наколькі кепскі быў узровень ведаў у выпускнікоў гімназій Літвы і Беларусі* (па-першае, у валоданні рускай мовай. – *В.Г.*). *Слухаць прафесарскія лекцыі ў Маскве, альбо, напрыклад, у Пецярбургу было немагчыма* [2, с. 162]. Хаця, зразумела, неабходнасць у набыцці вышэйшай адукацыі *ўзмацнялася з дня на дзень і адчувалася ў жыцці ўсё больш настойліва і настойліва* [2, с. 162].

У III главе ўспамінаў "Запіскі старога" пад назвай "Масква 1861–1864 гг." мемуарыст адзначае, што ў Расійскай імперыі таго часу значна ажывіўся нацыянальна-вызваленчы рух, актыўная роля ў якім належала польскай студэнцкай моладзі (Ogol studentow Polakow w Moskwie). У 1861 годзе польскі студэнцкі "Огул" яднаў каля 400 удзельнікаў [7, с. 194]. Як падкрэслівае М. Маркс, значная частка чальцоў "Огула" была моладзь, якая прыехала вучыцца ў Маскву *з велізарнай прасторы ад Заходняй Дзвіны і Дняпра да межаў імперыі з Прусіяй і Аўстрыяй* [2, с. 160]. У пачатку 60-х гадоў XIX стагоддзя кватэра Максіміліяна Восіпавіча была своеасаблівым польскім студэнцкім клубам. Мемуарыст заўважае: *Знаёмых у Маскве мы сустрэлі шмат. Прыйшла і ўніверсітэцкая моладзь, спачатку з віцебскіх і смаленскіх, а следам і з іншых мясцовасцяў. <...> Студэнцкі польскі гурток быў арганізаваны выдатна і ў маральных, і ў эканамічных адносінах* [2, с. 158–164].

**Заключэнне.** Максіміліян Восіпавіч Маркс – гэта не толькі змагар з царызмам, але і прыхільнік абуджэння і разняволення тагачаснага грамадства. Асабліва вялікая заслуга М.В. Маркса ў тым, што ён адзін з першых на Віцебшчыне, хто звярнуўся і стаў вывучаць вусную народную творчасць. Максіміліян Восіпавіч добра ведаў і шанаваў беларускую мову. Асветніцкая дзейнасць і цікавыя назіранні М.В. Маркса, безумоўна, сёння неабходныя лінгвістам, літаратуразнаўцам, этнографам і фальклярыстам.

## Літаратура


1. Маркс, М. Записки старика / М. Маркс // Віцебскі сшытак. – 1995. – № 1. – С. 74–77; 1996. – № 2. – С. 87–102; 1997. – № 3. – С. 137–147.
2. Маркс, М. Записки старика / М. Маркс // Исследования по истории польского общественного движения XIX–XX в.: сб. ст. / под ред. В.А. Дьякова [и др.]. – М., 1971. – С. 154–196.
3. Bruchnalski, W. Emilia Platerówna jako folklorystka / W. Bruchnalski // Lud. – 1906. – T. XII. – S. 183–197.
4. Bruchnalski, W. Z pamiętnika M. Marksa Witebszczanina / W. Bruchnalski // Lud. – 1922. – T. XXI. – S. 136–153.
5. Мальдзіс, А.І. Таямніцы старажытных сховішчаў. Да гісторыі беларускай літаратуры XVII–XIX стагоддзяў / А.І. Мальдзіс. – Мінск, 1974. – 176 с.
6. Кісялёў, Г.В. Радаводнае дрэва: Каліноўскі – эпоха – настаўнікі / Г.В. Кісялёў. – Мінск, 1994. – 303 с.
7. Федосова, Т.Ф. Воспоминания Максимилиана Маркса «Записки старика» / Т.Ф. Федосова // Исследования по истории польского общественного движения XIX–XX вв.: сб. ст. / под ред. В.А. Дьякова [и др.]. – М., 1971. – С. 148–154.


*Паступіў у рэдакцыю 06.07.2016 г.*